# Займеннік

## § 65. Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні (азнаямленне)

**416.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваю думку.

**Ад роду да народу**

Я, Ты, Ён, Яна — людзі на планеце Зямля.

У **кожнага** чалавека сваё Я. Кожны чалавек — Асоба! Кожнае чалавечае жыццё — Кніга! А сам чалавек — гэта цэлая планета.

Але як бы чалавек ні выстаўляў **сваё Я**, ён заўсёды павінен помніць пра сваіх бацькоў[м] і дзядоў. За сто гадоў мяняецца прыкладна тры пакаленні людзей. У такім выпадку **наша** Я атрымала спадчыну ад дзесяці пакаленняў. **Яны** на працягу **стольkіх** гадоў «ляпілі» сённяшняга цябе, мяне, яго, яе... Ці апраўдваем **іх** давер? *(Паводле У. Ліпскага)*.

Якое значэнне мае слова *Я* ў тэксце? Да якой часціны мовы яно адносіцца? Назавіце ў тэксце іншыя займеннікі, якія ўказваюць на асобу.

Выдзеленыя ў тэксце словы называюць прадметы, прыметы, колькасць ці толькі ўказваюць на іх?

!

**Займеннік** — гэта часціна мовы, якая не называе прадметы, прыметы, колькасць, а толькі ўказвае на іх: *Мова — жывая істота. **Яна** жыве, а не існуе* (К. Чорны). *Нідзе няма **такіх** бяроз, як на **маёй** Радзіме* (Н. Загорская).

Калі займеннік указвае на прымету ці колькасць прадметаў, то ўжываецца з назоўнікам: ***такія** бярозы, **столькі** год, **мая** Радзіма.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**417.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Падбярыце загаловак.



Сапраўдны гонар вёскі Бездзеж Драгічынскага раёна — тканыя бялюткія[с] фартухі. Здаўна для вырабу **такіх** фартухоў майстрыхі выкарыстоўвалі найтанчэйшыя[м] льняныя ніткі. Трыста такіх нітак павінны былі прайсці праз заручальны* пярсцёнак. Калі **столькі** нітак праходзіла праз яго, то **іх** можна было выкарыстоўваць для далейшай працы. У вёсцы быў створаны музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» *(Паводле А. Коршак).*

Вызначце, якое з выдзеленых слоў указвае на прадмет, якое — на прымету, а якое — на колькасць прадметаў.

Разгледзьце фотаздымак. Якія ўзоры выкарыстоўваюцца на бездзежскіх фартухах? Складзіце два сказы з займеннікамі.

***фарту́х***

**!** Займеннік ужываецца замест назоўніка, прыметніка, лічэбніка і мае агульныя з імі марфалагічныя прыметы.

Усе займеннікі змяняюцца па склонах. Займеннікі, якія замяняюць прыметнікі, маюць род і лік: *сам, сама, само — самі; увесь, уся, усё — усе*. У іншых займеннікаў род і лік праяўляюцца непаслядоўна. Лік маюць асабовыя займеннікі (*я, ты, ён, яна, яно* (адз. л.); *мы, вы, яны* (мн. л.)); род — толькі асабовыя займеннікі 3-й асобы *(ён, яна, яно)*. Усе астатнія займеннікі роду і ліку не маюць.

**418.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Тонкі прамен..чык ранішняга сонца дакрану..ся да ствала белай бяро..кі. Прамен..чык стараўся сагрэць **яе** шчырым ц..плом. Бяро..ка а..чула **гэта** ц..пло, зашалясцела светла-зялёнымі[сл] лісточкамі, пачала страсаць[с] з **іх** рэшткі* ран..шняй вільгаці.

«Якія ж прыгожыя ў нас бярозы!» — падумаў прахожы. **Ён** абняў бярозку, і **яму** стала лёгка і радасна *(Паводле Т. Дамаронак).*

Замест якіх слоў ужываюцца выдзеленыя займеннікі?

Запішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх напісанне. Падкрэсліце займеннікі як члены сказа.

Паводле значэння займеннікі падзяляюцца на разрады:

1) **асабовыя:** *я, ты, мы, вы, ён (яна, яно), яны*;

2) **зваротны:** *сябе*;

3) **прыналежныя:** *мой, твой, наш, ваш, свой, яго, яе, іх*;

4) **указальныя:** *гэты, той, такі, гэтакі, гэтулькі, столькі*;

5) **азначальныя:** *сам (сама, само, самі), самы (самая, самае, самыя), увесь (уся, усё, усе), усякі (усялякі), кожны, любы́, іншы, інакшы*;

6) **пытальныя:** *хто? што? які? чый? каторы? колькі?*;

7) **адносныя:** *хто, што, які, чый, каторы, колькі*;

8) **няпэўныя (неазначальныя):** *нехта, хтосьці, хто-небудзь, абы-хто, нешта, штосьці, што-небудзь, абы-што, нейкі, нечы, некаторы, які-небудзь, чый-небудзь, якісьці, чыйсьці, абы-які, абы-чый, некалькі*;

9) **адмоўныя:** *ніхто, нішто, ніякі, нічый, нікольк*і.

**419.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, чаму ён так называецца.

### Каго не бачаць

Дзяўчынка Зоя дакладна адпавядала свайму імені, у якім можна заўважыць 30 Я. За дзень яна сапраўды паспявала заняцца трыццаццю[м] справамі. «Я сёння памалявала!», «Я сёння пачытала!», «Я сёння павучылася!» — бясконца паўтарала яна.

Бабуля п..слухала як унучка выхваля..цца і п..прасіла яе паказаць свае малюнкі. А малюнкі абы-якія. П..прасіла пер..казаць прачытаную кнігу а Зоя амаль нічога не пам..тае. Пагл..дзела бабуля сшыткі[ф] а там у кожным слове памылкі.

— Чамусьці я цябе нідзе не бачу, — кажа бабуля ўнучцы.

— Як не бачыш? Я ж і там, і там, і там...

— Вось якраз таму і не бачу. Хто паўсюль, той нідзе (*Паводле А. Спрынчан*).

Выпішыце з тэксту займеннікі. Вызначце іх разрад.

Утварыце прыналежныя прыметнікі ад слоў *Зоя, бабуля, унучка*.

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і ставячы знакі прыпынку.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**420.** Напоўніце «чароўны куфэрак» фразеалагізмамі з займеннікамі. Вызначце іх разрад.

1. Сёмая[м] вада на кісялі. 2. Кусаць сабе локці. 3. Ні ў якія вароты. 4. Пасля дожджыку ў чацвер. 5. І нашым і вашым. 6. Ад усяго сэрца. 7. Аж у роце чорна. 8. Не ў свае сані сесці. 9. На першы погляд. 10. Як ні ў чым не бывала. 11. На адзін капыл.

Які фразеалагізм мае значэнне ‘злы чалавек’? Разгледзьце фотаздымак ку́фра з роспісам майстроў з вёскі Агова Іванаўскага раёна. Што адлюстравана на куфры? Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, раскажыце пра гэтыя куфры.



**421.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Разрады займеннікаў па значэнні».

## § 66. Асабовыя займеннікі

**422.** Прачытайце табліцу. Вусна дапоўніце яе склонавымі пытаннямі і прыкладамі форм займеннікаў.

| Склон | Пытанне | Скланенне асабовых займеннікаў | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | х т о? | *я* | *ты* | *мы* | *вы* |
| Р. | к а г о? | … | *цябе* | *нас* | … |
| Д. | … | *мне* | … | … | *вам* |
| В. | к а г о? | … | *цябе* | *нас* | … |
| Т. | … | *мной (-ою)* | *табой (-ою)* | *намі* | *вамі* |
| М. | *(пры)* к і м? | *(пры) мне* | … | … | *(пры) вас* |

Складзіце сказы з займеннікамі *я* і *ты* ў родным склоне.

**Асабовыя** займеннікі ***я*** і ***ты*** ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку, а займеннікі ***мы*** і ***вы*** — толькі ў множным. Займеннікі *я, ты, мы, вы* не змяняюцца па родах.

Займеннікі 3-й асобы змяняюцца па ліках (*ён, яна, яно* (адз. л.); *яны* (мн. л.)) і па родах у адзіночным ліку (*ён* (м. р.); *яна* (ж. р.); *яно* (н. р.)). Усе асабовыя займеннікі скланяюцца.